Царэвіч Ю.Дз. ФК і СКД
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік –Барвенава Г.А.,
канд. мастацтвазнаўства, дацэнт

# ТРАДЫЦЫЙНЫЯ БАЯВЫЯ І СПАРТЫЎНЫЯ АДЗІНАБОРСТВЫ БЕЛАРУСАЎ

Са старажытных часоў у беларусаў баявыя і спартыўныя адзінаборствы былі сродкам падрыхтоўкі моладзі да жыцця, да працоўнай і ваеннай дзейнасці, своеасаблівай праверкай фізічных і маральных здольнасцей. Спартыўныя гульні і адзінаборствы адлюстроўвалі і дапаўнялі мастацкую культуру беларусаў [1]. Элементы старажытнага вайсковага мастацтва праходзілі праз стагоддзі, ахопліваючы ўсе класы грамадства. Баявыя і спартыўныя адзінаборствы на тэрыторыі Беларусі ўласцівы шляхецкай, гарадской і вясковай культуры.

Воінскае мастацтва, якое характэрна для традыцыйнай вясковай культуры на сенняшні дзень з'яўляецца недастаткова вывучаным і малавядомым. Таму ў артыкуле разгледжана воінскае мастацтва, якое праяўлялася ў вясковай культуры ў форме гульні, песні, танца.

У воінскай культуры і культуры спаборніцтваў беларусаў важнае месца займалі тэматычныя *песні і танцы*. Беларусы песнямі і музыкай суправаджалі маладзецкія забавы, напрыклад, кулачныя гульні і паядынкі на палках. Песняй байцы "заводзілі" сябе на бітву, "чаплялі" сапернікаў. Нярэдка былі і своеасаблівыя песенныя паядынкі, калі супернікі перад бойкай мяняліся з'едлівымі куплетамі, усяляк усхваляючы сябе і наадварот ганьбячы ворага. "Прыпевачныя паядынкі" (сёння гэта пераўвасобілася ў перабранку) заўсёды папярэднічалі бойцы.

Танец з'яўляўся не толькі сродкам падрыхтоўкі, але і праверкі спецыфічных ведаў, якія набыў воін. Характэрнай рысай многіх беларускіх народных танцаў з'яўляецца іх спаборніцкі характар. Нярэдка адзін танцор

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

змяняе другога, змагаючыся ў складанасці рухаў, іх хуткасці і тэмпе. Нярэдка спаборніцтвы праходзяць у форме дуэта, перапляскі "тварам да твара".

"Цікавы, невядомы раней мужчынскі сольны "Танец з бутэлькай" запісаны Ю.М. Чурко ў Мінскай вобласці. Ён праходзіць у форме своеасаблівага харэаграфічнага спаборніцтва: узяўшы ў рукі бутэльку ці заціснуўшы яе паміж кален, танцор павінен ісці па колу ўпрысядку. Перамагае той, хто, не падымаючыся ва ўвесь рост, пройдзе болей кругоў. Сама прысядка можа быць звычайнай, з падскокам на абедзьве нагі, з ударам пяткамі ў паветры, з выкідам ног уперад ці ў стораны, так званая "разножка", "закладка", "гусіны крок", "паўзунок" і інш. Суддзямі тут былі гледачы, якія ацэньвалі вынослівасць і вынаходлівасць танцора" [2].

У Беларусі этнахарэографы зафіксавалі і іншыя арыгінальныя танцы-паядынкі. Да такіх можна аднесці танец "Жабка", які бытаваў на поўдні Беларускага Палесся. У вёсцы Навасёлкі Кобрынскага раёна гэты танец, па сведчанню мясцовага жыхара Івана Ціхановіча Лашчыцкага (1909 г.н.), цудоўна выконваў Фёдар Іванавіч Марчук, які выдзяляўся вынаходлівасцю і пачуццём гумару. Абапіраючыся на падлогу выцягнутымі ўперад рукамі і наскамі ног, ён перабіраў рукамі і нагамі хутка па колу, вырабляючы розныя выкрунтасы, падпрыгваючы як жаба, выстукваючы далонямі і наскамі ў такт музыцы і г.д.

*Спартыўна-гульнёвыя спаборніцтвы*, якія праходзілі ў буйных вёсках і гарадах, ўключалі бег навыперадкі і бег з перашкодамі, кулачныя баі і баі на палках, барацьбу, а таксама гульні: азярод, бабкі, гуські, пацяг і інш. Здаўна ў беларусаў практыкаваліся розныя віды барацьбы ("на крыжа", "да крыжа", "у абхват", кулачныя баі), у якіх удзельнічалі і маладыя хлопцы і сталыя мужчыны.

Народная гульня - барацьба "да крыжа" нагадвае сучасная вольную барацьбу. Барцам дазваляецца штурхаць адзін аднаго, даваць падножкі, хапаць за ногі. Перамагае той, хто прыцісне праціўніка спіною да зямлі і ўтрымае яго рукі, разведзеныя ў бокі. Яшчэ адна народная гульня – барацьба "на крыжы"

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нагадвае рускую барацьбу ў абхват. Праціўнікі абхопліваюць адзін аднаго, і той, хто паваліць праціўніка на зямлю той і пераможца. Падножкі, штуршкі не дазваляюцца.

Традыцыйная гульня ў "пеўня" можа праводзіцца на роўнай пляцоўцы. Адначасова ў гульні ўдзельнічаюць два чалавека. Гуляючыя закладваюць рукі за спіну, падгінаюць адну нагу і, скачучы на другой, штурхаюць праціўніка грудзьмі ці плячом. Той, хто страціць раўнавагу і стане на зямлю дзвюма нагамі, выбывае з гульні.

Гульня "падхват" праводзіцца на заснежаным схіле гары. Для гульні неабходна мець санкі, невялікія прадметы, да пыкладу шышкі. Колькасць гуляючых неабмежаваная. На схіле ўздоўж накатанай каляіны раскладаюцца шышкі. З'язджаючы з гары ігрок на хаду падхоплівае іх. Па колькасці сабраных шышак выяўляюць пераможцу.

Старажытная беларуская гульня-практыкаванне "зачэп", у якой удзельнічаюць двое гуляючых, гуляецца за сталом. Удзельнікі, седзячы або стоячы насупраць за сталом, сярэднімі фалангамі пальцаў правай (левай) рукі стараюцца перацягнуць партнёра. Другой рукой упіраюцца ў стол. Прайграе той, хто першы разагне палец [3].

Такім чынам традыцыйныя баявыя і спартыўныя адзінаборствы, якія былі ўласцівы вясковай культуры, на працягу стагоддзяў займалі важнае месца ў паўсядзённым жыцці беларуса. Яны ўключалі ў сябе розныя спартыўныя практыкаванні, змаганні без зброі, воінскія гульні, танцы і песні. Роля песні і танцу ў воінскім мастацтве беларусаў была надзвычай вялікай і шматгараннай, дэманстравала сілу, вынаходніцтва, вынослівасць мужчыны перад усёй раднёй або вёскай. Адроджаныя ў сваім старадаўнім варыянце або пераасэнсаваныя і трансфармаваныя беларускія традыцыйныя спартыўныя гульні, песні, танцы могуць стаць дзейным сродкам выхавання сучаснай моладзі, папулярызацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

традыцыйных баявых і спартыўных адзнаборстваў, працягам тысячагадовай традыцыі.

Літаратура:


1. Мандзяк, А. С. Славянские воинские искусства: От культа Земли к воинскому поединку / А.С. Мандзяк. Под общ. ред. А. Е. Тараса. – Мінск : Харвест, 2006 – 320 с.
2. Чурко, Ю.М. Белорусский хореографический фольклор / Ю.М. Чурко. – Минск : Выс. шк., 1990. – 415 с.: ил.Беларускія летапісы і хронікі : пер. са старажытнарус. старабеларус. І польск. / уклад.: У. Арлова. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997. – 432 с. : іл.
3. Вількін, Я.Р. Беларускія народныя гульні / Я.Р. Вількін // Зборнік дзіцячых гульняў. – Мінск : Нар. асвета, 1969. – 111с.
4. Вуглік, І.Р. Матэрыяльная культура і быт беларусаў у 17-18 стст. / І.Р. Вуглік. – Мінск : БДПУ, 2005. – 114с.
5. Мальдзіс, А. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры 18 стагоддзя: нарысы быту і звычаяў / А. Мальдзіс. – Мінск : Маст. літ., 1982 – 256с.
6. Сыракомля, У. Вандроўкі па маіх былых ваколіцах: успаміны, даследаванне гісторыі, звычаяў / У. Сырыкомля // Пер. з пол. мовы, прадм., камент. К. Цвіркі. – Мінск : Маст. літ., 2002. – 205с.

Дадзіёмава, В.У. Гісторыя музычнай культуры Беларусі ад старажытнасці да канца 18 ст. / В.У. Дадзіёмава. – Мінск : Беларускі гуманітарны адукацыйна-культурны цэнтр, 1994. -96 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ